Дзяржаўная установа  адукацыіі
«Сярэдняя  школа №17» г. Ліды

# *Навукова-краязнаўчая работа па тэме “Развіццё архітэктурнай планіроўкі і вуліц горада Ліды XIX –  XX ст.”*

Выканала: Мартінкевіч Вераніка,
8 “Г” класс

Кіраўнік: Талкачова Вольга Аляксандраўна
Настаўнік гісторыі
Тел.  80298743603
Адрас установы адукацыі:
231300, г. Ліда, в. Рыбіноўскага, д. 76,
тел. (0154) 652975

Ліда 2020

Змест


Уводзіны………………………………………………………………………….3

Развіццё архітэктурнай планіроўкі і вуліц пачатку XIX -п.п XX ст…………….4

Эвалюцыя тапанімікі вуліц горада Ліды ў міжваенны перыяд……….………6

Асноуныя тэндэнцыі эвалюцыі тапанімікі гарадской забудовы ў другой палове XX ст………………………..………………………………….………..….….10

Заключэнне………………………………………………….…………….....…16

Спісак выкарыстаннай літаратуры……………………………….………..…...17

Дадатак А……......……………………………………………………………..…18

## *Уводзіны*

З даўніх часоў чалавека хвалююць пытанні аб назвах, аб іх паходжанні. Узнікае пытанне - навошта трэба шукаць у глыбіні вякоў пачатак той ці іншай назвы? Якая розніца, калі і як яна ўзнікла? Трэба разумець тыя назвы, што засталіся ў спадчыну ад продкаў, знайсці іх вытокі. Назвы вуліцам даюцца не выпадкова, яны ўзнікаюць у канкрэтных гістарычных умовах, адлюстроўваюць розныя бакі жыцця і дзейнасці чалавека.

Гарадскія вуліцы - не толькі шляхі руху яго жыхароў, месца размяшчэння сфер і аб'ектаў жыццядзейнасці - твар горада. Па іх забудовах, памятніках, якія захаваліся, падзеях, якія ў ім адбываліся, у шматлікім можна ўявіць мінулае, яго гістарычную біяграфію.

Назвы вуліц могуць расказаць нам пра гісторыю горада, быт і дзейнасць яго гараджан у мінулым і сучасным. У гэтым заключаецца актуальнасць выбраннай тэмы работы.

Аб’ектам даследвання мы выбралі горад Ліда. Прадметам даследвання сталі вуліцы горада Ліды і архетектурная планіроўка горада.

Галоўнай мэтай работы стала вывучэнне тапанімікі гарадской пабудовы Ліды. Задачы работы:

1. Азнаёміцца з развіццём архітэктурнай планіроўкі вуліц горада пачатку XIX – п.п XXст.
2. Азнаёміцца з эвалюцыяй тапанімікі вуліц горада Ліды ў міжваенны перыяд
3. Азнаёміцца з асноўнымі тэндэнцыямі эвалюцыі тапанімікі гарадской забудовы ў другой палове XX ст.

Старажытны горад Ліда. Вуліцы, якія сёння спавіваюць яго ўздоўж і ўпоперак, быццам маршчыны на твары чалавека. І чым большы век, тым і маршчын больш. Розніца толькі ў тым, што яны (маршчыны) не знікаюць з твару, а даюцца чалавеку ў дар за пражытае. А вось вуліцы па волі таго ж чалавека часта хаваюцца за адступіўшымі ў нябыт гадамі, а бывае, раптоўна нараджаюцца, становяцца вядомымі і галоўнымі.

***Развіццё архітэктурнай планіроўкі і вуліц пачатку XIX – п.п XXст.***

На пачатку XIX стагодцзя ў Лідзе існавалі наступныя вуліцы: Замкавая (назва ўказвае на месца знаходжанне аб'екта, можна меркаваць, што менавіта гэта вуліца была першай у горадзе, таму што Ліда начала развівацца ад замка), Віленская (супадала з Віленскім трактам, адсюль і паходжанне назвы), Каменская (атрымала назву ад ракі Каменка), Крывая (назва ідзе ад знешніх асаблівасцей вуліцы), Дваровая (Дварцовая) (назва паходзіць ад слоў двор або дварэц - невялікі двор). Існавалі таксама цэнтральная плошча - Рынак і і Школьны двор.

Захаваўся план 1798 года, на якім відна, што гарадскія землі з усходу абмяжоўваліся ракой Лідзейкай, з Захаду - ракой Каменкай, з поўдня прымыкалі да замка, а на поўначы выходзілі за лінію сучаснай вуліцы Міцкевіча. У горадзе было каля 250 будынкаў, каля сцен замка - велізарны стаў. Уздоўж Гарадзенскага тракта - прадмесце Каменка. На паўдневым усходзе - вёска Зарэчная. На паўночным захадзе - фальварак і вёска Куроўшчына.

Частыя пажары не давалі магчымасці для развіцця і забудовы горада. Да 1842 года ўзводзіліся пераважна драўляныя забудовы, для будаўніцтва якіх высякаліся масівы Дакудаўскай і Воранаўскай пушчаў. Толькі пасля пажару 1842 года, які знішчыў Школьны двор, частку дамоў каля Рынка і ўсю Віленскую вуліцу, у Лідзе сталі будаваць каменныя дамы. [6, с.23]

У 1842 годзе быў складзены план Ліды, на якім бачна, што горад забудоўваўся ўздоўж паштовых дарог на Вільню і Навагрудак. На плане адзначаны: два рымска-каталіцкія кляштары (піярскі і кармяліцкі), гаўпвахта, крамы, замак, шпіталь, павятовае казначэйства, яўрэйская школа, гарадскі астрог, яўрэйскія і хрысціянскія могілкі. [9, с.135]

У сярэдзіне XIX стагоддзя Ліда - гэта "адна доўгая вуліца Віленская, якая праходзіць па ўсей даўжыні горада на працягу вярсты. Папярок другая вуліца - Каменка, па баках вуліцы кароткія: Сенатарская і Крывая і, нарэшце, Рынак, на якім прадаюцца розныя прадукты". [6, с.32]

У другой палове XIX стагоддзя ажывілася эканамічнае жыццё Ліды. У

1863 годзе быў пабудаваны піваварaны завод Пупко, а ў 1873 годзе - другі (уладальнік Папірмейстер). У 1891 годзе ў горадзе ўжо было 10 фабрык і заводаў. На развіццё горада вялікі ўплыў аказала чыгуначнае будаўніцтва. У 1882 годзе адна з ліній палескіх чыгунак пралягла праз Ліду. У 1884 годзе ў горадзе былі пабудаваны паравознае дэпо і першы чыгуначны вакзал. Да ранейшых вуліц: Віленскай, Дварцовай, Замкавай, Каменскай і Крывой дадалася Аляксандраўская, з'явілася 9 завулкаў: Завальны, Лідскі, Камерцыйны, Паліцэйскі, Садовы, Шкляны, Гандлёвы, Школьны і Яраслаўскі. На працягу XIX стагоддзя Ліда ператварылася з мястэчка ў даволі буйны па тых мерках горад, яки быў цэнтрам асветы. У 1899 годзе ў Лідзе было 16 вуліц і завулкаў, 2 плоіпчы. На пачатак XX стагодцзя ў Лідзе як і раней пераважала драўляная забудова. Пастyпова пашыраецца цэнтр з мураванымі пабудовамі. У пачатку XX стагоддзя ў горадзе было каля 1000 дамоў (з іх 275 мураваных). У той час Ліда становіцца вузлавой станцыяй, якая звязвае прамысловыя цэнтры Расіі, Польшчы, Украіны. Ажыццяўляецца прамысловае будаўніцтва: у 1901 годзе пабудаваны ліцейны завод, адкрыўся коркавы завод, тыпаграфія і тытунёвая фабрыка. Значка ўзрастае колькасць насельніцтва. У 1904 годзе яно падвоілася ў параўнанні з 1893 годам і склала 15025 чалавек. У 1904 годзе ў Лідзе было ўжо 14 прадпрыемстваў, 140 рамесных майстэрань, 4 бальніцы.

На 1903 год у Лідзе 14 вуліц: Алёксандраўская, Віленская, Дваранская,Замкавая, Каменская, Камерцыйная, Крывая, Лідская, Паліцэйская, Пастаўская,Садовая, Сядлецкая, Шкляная, Гандлёвая і 10 завулкаў: Алёксандраўскі, Завальны, Замкавы, Лідскі, Чырвоны, Крупскі, Міхайлаўскі, Гандлёвы, Школьны і Яраслаўскі; дзве плошчы: Базарная і Школьны двор. [2, с.58] У 1906 годзе з'явіліся дзве новыя вуліцы: Вакзальная і Школьная і два завулкі: Моргаўскі і Сянны. Перад Першай Сусветнай вайной, у 1913 годзе ў Лідзе 17 вуліц і 11 завулкаў; дадалася Крупская вуліца, якая вырасла з Крупскага завулка. У імперскі час (да 1915 года) назвы вуліц мянялі вельмі рэдка. Адзіны вядомы выпадак: вуліца Паштовая ў 1892 годзе стала Паліцэйскай. [11, с.58]

Напярэдадні вайны насельніцтва горада склала 18 тысяч чалавек. У тэты час назіраецца новая архітэктурная стылістыка - ў дамах, размешчаных у цэнтры, будуюцца балконы. Вуліца Віленская забрукавана, па абодва бакі меліся сцёкі для вады. Дамы стаялі блізка адзін да аднаго, на іх было шмат вывесак, вокны закрываліся стаўнямі. Па баках размяшчаліся ліхтары. Тратуары былі вельмі вузкія. Дамы ў асноўным каменныя, адна-двухпавярховыя. Ушчыльную да сцен замка падыходзіла драўляная забудова.

2 жніўня 1914 года пачалася Першая Сусветная вайна і ўжо ў верасні 1915 года горад быў акупіраваны нямецкімі вайскамі. Болей як тры гады працягвалася акупацыя Лідскага павета. Нямецкія салдаты падвяргалі горад грабяжу і запусценню: вывозілі скаціну, маемасць, высякалі вялікія масівы дрэў. Большнасць прадпрыемстваў не працавала, навучальныя ўстановы былі закрыты, шмат дамоў пуставала. [8, с.123]. Пасля вайны з’явіліся новыя вуліцы - Шкляная, Сядлецкая і іншыя. Згодна дадзенай крыніцы, Ліда ў 1919 годзе ў рамках гарадской тэрыторыі мела 26 вуліц і завулкаў, 2 плошчы. [1, с.277]

Назвы вуліц горада не зведалі якіх-небудзь сур'ёзных змен у сувязі з станаўленнем у ім савецкай улады, зрэшты, хутка ўступіўшай месца польскай адміністрацыі. У назву вулічнай сеткі горада не былі ўнесены істотныя змены і яна захавалася ў ранейпіым выглядзе.

### *Эвалюцыя тапанімікі вуліц горада Ліды ў міжваенны перыяд*

Пачынаючы з 30 верасня 1920 года і на працягу амаль дваццаці год, Ліда знаходзілася пад уладай Польшчы і з'яўлялася цэнтрам павета Навагрудскага ваяводства. Хаця ваенныя падзеі і прывялі да разбурэння і запусцення горада, пачынаючы з другой паловы 20-ых гадоў ідзе ажыўленне ў прамысловым і будаўнічым жыцці. У тэты перыяд у горадзе ўступаюць у строй цвікавы завод, абутковая фабрыка, электрастанцыя.

У 1921 годзе насельніцтва Ліды складала 13400 чалавек, а праз дзесяць год, у 1931 годзе - 19500 чалавек. На пярэдадні Другой Сусветнай вайны яўрэйскае насельніцтва ў Лідзе складала 38% ад усіх жыхароў горада. Яўрэі

пераважалі ў гандлі і валодалі амаль усімі майстэрнямі. У цэнтры горада знаходзілася сінагога.[3, с.11]

Сярод сучаснай забудовы горада захаваліся жылыя дамы, узведзеныя менавіта ў 20-я гады. На скрыжаванні вуліц Камсамольскай і Замкавай знаходзіцца дом №3, пабудаваны ў 1925 годзе. Узведзены з цэглы як жылы. На Камсамольскай вуліцы размешчаны дом №4, пабудаваны ў 1928 годзе з цэглы. Насупраць замкавай сцяны знаходзіцца дом №6, пабудавана таксама з цэглы двухпавярховы аб'ем блізкі ў плане да прамавугольнага, накрыты вальмавым дахам. Па вуліцы Савецкай сярод сучаснай забудовы выдзяляюцца жылыя дамы №23, 26, 31, 32, таксама ўзведзеныя ў 20-ыя гады XX ст. Фрагмент жылой забудовы па вуліцы Савецкай і Камсамольскай з'яўляецца помнікам горадабудаўніцтва, у якім увасобілася мастацка-стылявая разнастайнасць архітэктуры 20-х гадоў XX ст. [6, с.57]

У 30-ыя гады горад актыўна забудоўваўся, з'явіліся дзеряткі новых вуліц на Слабадзе, на Кашарах, Песках, на выгане, на Зарэччы. За перыяд з 1918 па 1939 год у Лідзе было пабудавана 400 дамоў.

У газеце "Ziemia Liadzka" за 1939 год пісалася: "У чэрвені 1939 года гарадская ўправа ў Лідзе прыступіла да састаўлення агульнага плану забудовы горада, які састаўлены па навейшых метадах градабудаўніцтва. У Ішане тым прадугледжаны вадаправод і каналізацыя, а таксама гладкае пакрыццё вуліц".[4]

3 дарэвалюцыйных назваў вуліц засталося толькі адзінадцаць: Віленская, Гандлёвая, Замкавая, Камерцыйная, Крупская, Лідская, Пастаўская, Садовая, Сядлецкая, Шкляная, Школьная. Завулкі Завальны, Моргаўскі, Чырвоны сталі вуліцамі. Аляксандраўская, Дваранская, Каменская, Паліцэйская вуліцы і сем завулкаў: Аляксандраўскі, Гандлёвы, Замкавы, Лідскі, Крупскі, Міхайлаўскі, Школьны, Яраслаўскі былі перайменаваныя.

Новым вуліцам гарадскія ўлады давалі польскія назвы. З'явілася 24 імянныя вуліцы: Гедзімінаўская, Гражыны, Домб-Бярнацкага, Жалігоўскага, Жаромскага, Жвіркі, Еселевіча, Касцюшкі, Кілінскага, Мацкевіча, Міцкевіча,

Мянніцкага, Нарбута, Нарутовіча, Орліг-Дрэшара, Пераца, Пілсудскага, Пярацкага, Райнеса, Рыдз-Сміглага, Скарупкі, Сыракомлі, Фалькоўскага, Шаптыцкага.

У 1940 годзе была перайменавана 21 імянная вуліца з 24. Толькі Жаромскі, Перац і Міцкевіч былі прызнаны сацыяльна блізкімі для новай улады. Зніклі вуліцы Вясёлая, Дзяканка, Палеская. З'явіліся чатыры новыя вуліцы: Базарная, Інтэрнацыянальная, Пескі, Маскоўская.

22 чэрвеня 1941 года пачалася Вялікая Айчынная вайна, якая прынесла гораду незлічоныя страты. Існуюць успаміны жыхаркі горада Яўгеніі Ярмонт: "22 чэрвеня 1941 года пасля бамбардзіроўкі запальнымі бомбамі горад Ліда быў ахоплены пажарам. Яго культурна-гандлёвы цэнтр перастаў існаваць, тым самым передваенная Ліда знікла. Уцалелі 2 касцёлы, затое знікла сінагога, размешчаная паміж рынкам і вуліцай Школьнай. Не захаваўся ні адзін будынак паміж касцёламі, рухнулі ўсе вялікія і маленькія магазіны. Вуліца Сувальская перастала існаваць, гэта была ўжо не вуліца, а дарога са страшных сноў".[9, с.76]

У 1941 годзе нямецкія акупацыйныя ўлады ўвялі свае назвы вуліц. Вуліца Фалькоўскага называлася Скарынаштрасэ, вуліца Ленінская - Танэнбергштрасэ. Нямецкія назвы ў памяці не замацаваліся. Падчас вайны вуліцы ў пабытовых размовах называліся так, як іх называлі да 1939 года. [7, с.345]

Да 1941 года вуліца Міцкевіча ў прамежку ад Савецкай да Ламаносава не існавала. Па звестках старажылаў, гісторыя ўзнікнення гэтай часткі вуліцы Міцкевіча выглядае наступным чынам. Вядома, што ў час акупацыі горада фашыстамі ў даваенным будынку гімназіі размяшчаўся гебіткамісарыят. Узначальваўшы ж яго гебіткамісар Ліды маёр Ханвег пражываў некалькі далей - у шыкарным асабняку, пабудаваным у даваенныя гады багатым купцом Вітажэнцам для свайго сына. Зараз гэта жылы дом Савецкая, 34, на перакрыжыванні з вуліцай Міцкевіча. І хоць жыллё Ханвега знаходзілася не так ужо далёка ад гебіткамісарыята, маёру даводзілася доўга дабірацца да працы. Справа ў тым, што ў раёне сучаснай СШ №4 тады працякала рэчка Каменка і

мясцовасць вакол была моцна забалочана. Кожны дзень гебіткамісар рабіў вялікі круг - уздоўж Савецкай да Кірава, а затым зварочваў на вуліцу Фалькоўскага (зараз Победы) да камісарыяту. Яму гэта надаела, і ён прыказаў пракласці прамую дарогу ад дома да работы. Да пракладкі вуліцы былі прыцягнуты яўрэі з гета, размешчанага ў раенецяперашняга "Лідсельмаша".

Спачатку балота засыпалі зямлей, якую вазілі на падводах. Затым праклалі праз Каменку мосцік і вымасцілі вуліцу каменнем. Хутка пасля гэтага рынак са звыклага месца (на сучаснай плошчы Леніна) перанеслі ў раён новай вуліцы. Размяшчаўся ён на вуглу сучаснага Парка культуры і адпачынку, прымыкаючага да будынка ваенкамата. Вуліца была вузкая - 5-6 метраў у шырыну. На балоцістай мясцовасці амаль не знаходзілася жадаючых будавацца, нават у пасляваенныя гады тут было ўсяго некалькі маленькіх драўляных домікаў уласных забудоўшчыкаў. І толькі ў 60-70-я гады, калі Каменку пусцілі па трубах, гэты адрэзак вуліцы Міцкевіча (ад вуліцы Савецкай да вуліцы Ламаносава) набыў сучасны воблік.

Войскі 3-га Беларускага фронту 8 ліпеня 1944 года ў 17 гадзін 30 хвілін уварваліся ў Ліду. Праз паўтары гадзіны горад быў вызвалены. У ліпені 1944 года вуліцам Ліды вернуты даваенныя савецкія назвы.

15 жніўня 1944 года па просьбе прадстаўнікоў 86-га Лідскага кавалерыйскага палка 32-й Смаленскай кавалерыйскай дывізіі выканкам Лідскага гарадскога савета пастанавіў дзеля ўвекавечання памяці камандзіра 86-га палка гвардыі падпалкоўніка Труханава А.Ф., які вызваляў Ліду, перайменаваць вуліцу Чыгуначную ў вуліцу Труханава. [7, с.235]

30 кастрычніка 1945 года выканкам перайменаваў вуліцу Гарнянскую ў вуліцу Ракасоўскага, вуліцу Каштанавую ў вуліцу Жукава, вуліцу Камунальную ў вуліцу Чарняхоўскага, вуліцу Пасялковую ў вуліцу Пакрышкіна, вуліцу Пагулянка ў вуліцу Зоі Касмадзем'янскай, вуліцу Шкляную ў вуліцу Янкі Купалы.

На 1945 год у параўнанні з 1940 годам знікла вуліц: Базарная, Балотная, Інтэрнацыянальная, Чырвоная, Маскоўская, Някрасава, Навінка, Папаніна,

Пескі, Пастаўская, Садовая. З'явіліся тры новыя: Вясенняя, Самаабароны, Талстога. Хасанская стала Хасанаўскай, 1-ая і 2-ая Кірава аб'ядналіся ў Кірава, Малая Дварцовая стала Малачыгуначнай, Пушкінская - Замкавай, Беларуская праспектам Перамогі. [11, с.112]

***Асноўныя тэндэнцыі эвалюцыі тапанімікі гарадской забудовы ў другой палове XX ст.***

Пасля заканчэння Другой Сусветнай вайны і перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, першароднай задачай для горада Ліда было наладжванне жыцця гарадскога насельніцтва, будаўніцтва жылля, аднаўленне прамысловасці. Па дадзеных гарадской камісіі па уліку ўронаў і злачынстваў, нанесеных нямецкімі акупантамі народнай гаспадарцы і жыхарам горада Ліды, гітлераўцамі былі ўзарваны і знішчаны 75% жылых дамоў і 80% прадпрыемстваў. Гарадское насельніцтва зменшылася напалову. З-за эканамічных цяжкасцей у перыяд з 1945 па 1950 гады было пабудавана толькі пяць дамоў. Горад знаходзіўся ў антысанітарным стане: засмецены вуліцы, забруджаны калодзежы, перапоўнены прыбіральні.[5, с.455]

5 кастрычніка 1948 года Савет Міністраў БССР прыняў пастанову "Аб праве грамадзян на будаўніцтва і пакупку індывідуальных жылых дамоў". Дазволы на будаўніцтва пачалі выдаваць з 1950 года, за пяцігодку маленькімі прыватнымі домікамі былі забудаваны Расплякі, Кашары, Слабада, Зарэчча, Пескі. З'явіліся дзесяткі новых кароценькіх вуліц і завулкаў.

На Расляках з'явіліся вуліцы імя Будзёнага, Мічурына, Паўлава, Пушкіна, Палзунова, Сечанава, Саўгасная, Хмяльніцкага, завулак Лідскі. На Кашарах - вуліцы: імя Лазо, Кашавога, Разіна, Мечнікава, Серафімовіча, Сталінградская. Паблізу шпіталя - Бялінскага, Філатава, Мінская, Нёманская, Шчарбакова. Цэткін, Вышынскага, Говарава, Чалюскінцаў, Кастрычніцкая, Сацыялістычная. На Слабадзе - Дзекабрыстаў, Молатава, Радзішчава, Рылеева, Пралетарская, Ціміразева, Ульянавых, Ушакова, завулак Жукава. На Вісманігах - вуліца Глінкі, Данскога, Жукоўскага, Лібкнехта, Мендзялеева, Някрасава, Пугачова.

На Зарэччы - вуліцы Кутузава, Баўмана, Жданава, Беларуская, Партызанская. Каля гарадской бальніцы - вуліца імя Балотнікава. Каля Паўднёвага гарадка - імя Сярова, на Сойкішках - вуліца Малахаўская.

26 мая 1955 года гарвыканкам зацвердзіў спіс гарадскіх вуліц. У спісе 148 вуліц і 15 завулкаў. Са спісу 1945 года зніклі вуліцы: Вясенняя, Гандлёвая, Жалезная, Жаромскага, Касмадзем'янскай, Крупская, Малая, Самаабароны. Алея Самаабароны стала вуліцай імя Молатава, Бярозавая - Рэвалюцыйнай, Вішнёвая - імя Матросава, Воўчая - імя Тэльмана, паўночна - заходні адрэзак вуліцы імя 8 Сакавіка імя Гастэла, Дубовая - завулкам Маркса, Доўгая - імя Тал стога, Яловая стала імя Чайкінай, Жураўліная - імя Тургенева, Завальная - імя Ламаносава, Закрытая вуліца стала завулкам Спартыўным, заходні адрэзак вуліцы Кірава - вуліцамі імя Неўскага і Балотнікава, паўночны адрэзак Куйбышава - вуліцай імя Сядова і Айвазоўскага, Малая Чыгуначная - Маладварцовай, затым імя Варашылава, Малапажарная - завулкам імя Чайкоўскага, паўночны адрэзак імя Маякоўскага - імя Дабралюбава, Пажарная - імя Чайкоўскага, Палявая - імя Карла Маркса, паўночна-ўсходні адрэзак Кулямётнай - завулкам імя Энгельса. Пушкінская -Замкавай, а былая Замкавая адышла да вуліцы Энгельса, 17 верасня -Камсамольскай, Сакаліная — Зайцавай, Сасновая - імя Заслонава, Стругі -Калгасная, Сельская завулкам Сельскім, Свярддоўская - імя Свярдлова, Ціхая -імя Нахімава, Тапаліная - імя Даватара, Вузкая - завулкам Лермантава, Кветкавая - імя Фурманава, Шырокая - імя Шаўчэнкі. Назвы вуліц Беларускай і Някрасава змясціліся на іншыя вуліцы, частка вуліцы Горкага стала імя Пархоменкі, частка вуліцы імя Люксембург стала вуліцай імя Герцэна, вуліца імя Крупскай стала завулкам імя Крупскай, частка вуліцы імя Калініна стала вуліцай імя Касцюшкі і завулкам імя Дабралюбава. [6, с.78]

22 мая 1958 года з мэтамі ўпарадкавання найменняў вуліц у горадзе ў сувязі з падрыхтоўкай да Ўсесаюзнага перапісу насельніцтва выканкам вырашыў нанава створанаму праезду ад вуліцы Чарняхоўскага да тэрыторыі гарпаліва прысвоіць назву "завулак Чарняхоўскага", праезд паміж вуліцамі

Свярдлова і Калгаснай, каля будынка 5-й школы назваць вуліцай Каперніка, праезд з вуліцы Гастэла на вуліцу Баграціёна, памылкова названы вуліцай Баграціёна, перайменаваць у вуліцу Касмадзем'янскай, праезд з вуліцы Крупскай да вуліцы Неўскага, які раней называўся вуліцай Куйбышава, перайменаваць у вуліцу 4-я Куйбышава, праезд, які ўтварыўся паралельна, назваць вуліцай 3-я Куйбышева, праезд, які забудаваўся паралельна вуліцы Куйбышава, назваць 2-я Куйбышава. Завулак Гомельскі перайменаваць у вуліцу Паўночную. Перайменаваць пачатак завулка Лідскага і 1-шы Саўгасны завулак у вуліцу Паўзунова. Перайменаваць 1-шы завулак Першамайскі ў вуліцу Камунараў, 1-шы, 2-гі і 3-ці завулкі Пляханава ў 1-шы, 2-гі і 3-ці завулкі - Камунара, 2-гі Першамайскі завулак перайменаваць у 1 -шы завулак Пляханава, 2-гі і 3-ці завулкі Арджанікідзэ - у 2-гі і 3-ці завулкі Пляханава, перайменаваць завулак Заслонава ў вуліцу Пляханава.

Пасля завяршэння будаўніцтва Дома афіцэраў (1958г.) і ўстаноўкі помніка Леніну (31.12.1958г.) на месцы Рынка (Базарнай плошчы), афармілася плошча, якую ў пачатку 60-х гадоў без нейкіх асаблівых пастаноў пачалі называць плошчай Леніна. [9, с.343]

У 60-ыя - пачатку 70-х гадоў прадаўжаецца масавая забудова горада. Архітэктура жылых дамоў 60-х гадоў падпарадкоўвалася планіровачнай структуры - уводзіліся прамавугольныя канфігурацыі ў плане будынкаў, пластыка фасадаў якіх будавалася на механічным паўтарэнні стандартных элементаў. Гэта прыводзіла да манатоннасці і безлікавасці знешняга вобліку не толькі асобных будынкаў, але і раёнаў масавай забудовы. Жылыя масівы 60-ых - пачатку 70-х гадоў складаліся з рада разрозненых кампанентаў без агульнага кампазіцыйнага замыслу. Жыллёвае будаўніцтва вялося ў заходняй і паўночнай частках горада. Пераважала 4-5 павярховая забудова (95% узводзімага жылля).

11 красавіка 1963 года, улічваючы шматлікія просьбы і пажаданні грамадзян горада аб увекавечанні памяці таленавітага беларускага паэта і мужнага рэвалюцыянера, які доўгі час жыў і працаваў у Лідзе, выканкам гарсавета перайменаваў вуліцу Лідскую ў вуліцу імя Валянціна Таўлая. 11

чэрвеня 1964 года ў сувязі з 20-годдзем вызвалення Ліды ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў выканкам гарсавета перайменаваў вуліцу Танкавую ў вуліцу імя Радзюка Трафіма Сямёнавіча, першага сакратара гаркама, члена ЦК КПБ, а вуліцу Кулямётную ў вуліцу імя Клімко Аляксандра Аляксандравіча, падпольшчыка. 15 красавіка 1965 года выканкам прысвоіў назву Пясчанай вуліцы, што забудоўвалася паралельна вуліцы Загараднай.

31 мая 1965 года вуліца Саўгасная перайменавана ў вуліцу імя Ігнатава Міхаіла Мікалаевіча, кіраўніка групы падполыпчыкаў у горадзе Ліда, вуліца Спартыўная - у вуліцу Шубіна Васіля Іванавіча, намесніка камандзіра партызанскай брыгады імя Кірава, вуліца Белагрудская - у вуліцу Выдайкі Мікалая Фёдаравіча, гвардыі маёра 3-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса, вуліца Шпітальная - у вуліцу імя Арцёменкі Мікалая Прохаравіча, гвардыі лейтэнанта 3-га гвардзейскага кавкорпуса, які загінуў пры вызваленні горада Ліды. 23 лістапада 1967 года выканкам, улічваючы просьбу аддзела міліцыі, перайменаваў вуліцу Паўночную ў вуліцу імя лейтэнанта міліцыі Грыцкевіча Ціхана Васільевіча і згадзіўся з прапановай аддзела КДБ паварот да паўднёвага гарадка назваць вуліцай імя Наскова Івана Міхайлавіча, былога супрацоўніка Лідскага КДБ, які геройскі загінуў 15 снежня 1948 года. У той жа дзень вуліца Дабралюбава была перайменавана ў вуліцу імя Лупава Ўладзіміра Васільевіча. 27 чэрвеня 1968 года выканкам праезду, які ўтварыўся за вуліцай Рачной, прысвоіў найменне "2-гі завулак Свярдлова", далучанаму да гарадской рысы праезду ў раёне міжкалгасбуду даў найменне "вуліца Паўночная".12 снежня 1968 года атрымалі найменне вуліца 2-ая Даватара, завулкі Заслонава, Кутузава, Ленінскі, Маскоўскі, 2-гі Лётны і 2-гі Горкага.

10 ліпеня 1969 года выканкам гарсавету, падтрымліваючы хадатайнщтва рэспубліканскіх арганізацый і Ўсесаюзнага юбілейнага камітэту, вырашыў прысвоіць імя класіка ўкраінскай літаратуры І.П. Катлярэўскага, быццам бы праходзіўшага службу ў Лідзе ў пскоўскім палку ў 1807-1808 гадах (чаго на самой справе ніколі не было) былой 4-й Куйбышаўскай вуліцы. [10, с.235]

7 мая 1970 года агульнай пастановай бюро Лідскага гаркама КПБ і

выканкама гарсавета для адзначэння 25-й гадавны перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне вуліца Гарыстая была перайменавана ў вуліцу імя А.Я. Стралкоўскага, чэкіста, актыўнага ўдзельніка Айчыннай вайны і станаўлення савецкай улады на Лідчыне, які загінуў 26 жніўня 1953 года.

5 мая 1972 года ў сувязі з 27-мі ўгодкамі з дня перамогі над фашысцкай Германіяй і 30-годдзем з дня сфарміравання Гвардзейскай, Валгаградскай, ордэна Леніна, двойчы Чырвонасцяжнай, орданаў Суворава і Кутузава вайсковай часткі выканкам вырашыў перайменаваць вуліцу Пясчаную ў вуліцу Героя Савецкага саюза Герасімава Сяргея Дзмітрыевіча, вуліцу Загарадную ў вуліцу Героя Савецкага Саюза Жабінскага Дзмітрыя Іванавіча, вуліцу 2-ую Маскоўскую ў вуліцу Героя Савецкага Саюза Акрэсціна Барыса Сямёнавіча.

26 красавіка 1973 года для ўшанавання 28-х угодкаў перамогі над фашысцкай Германіяй і з мэтай увекавечвання памяці савецкіх воінаў, якія вызначыліся пры абароне горада Ліды ў першыя дні вайны, а таксама актыўных удзельнікаў партызанскага і падпольнага руху ў горадзе Лідзе і раёне ў гады Вялікай Айчыннай вайны, загінуўшых у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, выканкам вырашыў перайменаваць вуліцу Загарадную ў вуліцу імя Галіцкага Кузьмы Нікіціча. Забыўшыся, што год назад яна ўжо была перайменаваная ў вуліцу Жабінскага; вуліцу 2-ю Кіеўскую ў вуліцу імя Кастраміной Марыі Іванаўны, актыўнай удзельніцы падпольнага і партызанскага руху; вуліцу 2-ю Чырвонаармейскую ў вуліцу імя Рыбіноўскага Васіля Аляксандравіча, начальніка опергруппы, якая дзейнічала на тэрыторыі Лідскага раёна і горада Ліды; вуліцу 2-ю Вільнюсскую ў вуліцу Кахановіча Міхаіла Паўлавіча, актыўнага ўдзельніка партызанскага руху на Лідчыне; 3-ці завулак Чарнышэўскага ў вуліцу імя Наказных Матроны Канстанцінаўны, актыўнай удзельніцы падполля ў горадзе Лідзе, 4-ты завулак Энгельса ў вуліцу імя Кудачовых Леаніда Фёдаравіча і Зоі Фёдараўны, актыўных удзельнікаў падполля ў горадзе Лідзе; праектавую вуліцу, якая ідзе ад Менскай шашы да Лакафарбавага завода назваць вуліцай імя Качана Антона Гаўрылавіча, актыўнага ўдзельніка падполля ў горадзе Лідзе; вуліцу 4-ю Маскоўскую - у

вуліцу імя Коннава Аляксандра Андрэевіча, былога камандзіра першага на лідчыне партызанскага аддзела "Іскра" ў гады Вялікай ; Айчыннай вайны.

30 мая 1973 года выканкам, усвядоміўшы сваю памылку і змяняючы сваё рашэнне ад 26 красавіка 1973 года, перайменаваў вуліцу 3-ю Маскоўскую ў вуліцу імя Галіцкага Кузьмы Нікіціча, камандзіра 24 стралковай дывізіі.

# Заключэнне

Навукова краязнаўчая работа па тэме “Развіцце архітэктурнай планіроўкі і вуліц горада Ліды XIX - XX стст.” прадстаўляе сабой даследчую прапу па вывучэнню архітэктуры і вуліц горада Ліды.

Займаясь навукова краязнаўчай работай мы сабралі матэрыял аб развіцці горада Ліда, забудове розных мікрараенаў і вуліц горада. У выніку працы мы пазнаеміліся з рознымі матэрыяламі, навукова-даследчымі дакументамі, дакументамі перыядычнага друку, фота і кінаматэрыяламі, пазнаеміліся з рознымі цікавымі людзьмі, прайшліся па вуліцам горада. У ходзе работы намі былі даследвана развіцце архітэктурнай планіроўкі і вуліц горада Ліды пер.п. XIX – XX стст. Так сама мы азнаеміліся з асноўнымі і новымі тэндэнцыямі эвалюцыі тапанімікі гарадской забудовы Ліды. Вельмі цікавай часткай працы стала і знаемства з лідскімі гарадскімі харонімамі.

Праведзеная работа спрыяе грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню, фарміраванню ў вучняў любові да свайго роднага краю, пачуццю гонару за Беларусь. У гэтым заключаецца тэарэтычнае і фактычнае значэнне нашай навукова краязнаўчай работы.

Тэарэтычныя матэрыялы даследвання могут быць выкарыстаны в краязнаўчай работе школьных музеев. Матэрыялы даследвання магчыма выкарыстовываць пры правядзенні ўрокаў па гісторыі Беларусі “Наш край”, а так сама у выхаваўчай работе классных кіраўнікоў, у грамадска-патрыятычным выхаванні вычняў і прывіцця любві к малая раздіме.

Спіс выкарастаннай літаратуры


1. «Память. Лида и Лидский район: Исторически-документальные хроники городов и районов Беларуси». Редколлегия: В.Г. Баранов, Г.К. Киселев, М.У. Малец, Б.В. Ульянка Художник: Э.Э. Жакевич. Минск, 2004 - 566 с.
2. «Летапіс ТБМ. 1989 - 2009». Редколлегия: секретариат ТБМ и редакция газеты «Наша слова». Лида, 2011. 164 с.
3. Фрагмент статьи из краеведческого историко-литературного журнала «Лідскі летапісец». 1997. - Лида. 20 с.
4. Szymielewicz M. Dzieje pijarow Lidzkich.//ZiemiaLidzka. 1939. № 49, с.7.
5. Кулібін А.А. Малаіта Н.Г. Беларуская энцыклапедыя: / Кулібін А.А. Малаіта Н.Г.: Т.9. Мн. 1999. С.577.
6. Краўцэвіч А.Н. Гарады і замкі Беларускага Панямоння / А.Н. Краўцэвіч - Мн. 1991. С.100.
7. Фрагмент статьи из краеведческого историко-литературного журнала «Лідскі летапісец». Аб пераназванні вуліц і бульвараў/ Лідскі летапісец №2 (50) , 2010 г– красавік-чэрвень, с.7.
8. Лаўрэш Л.Г. Селішчы і гарадзішчы гістарычнай Лідчыны / Наша Слова № 27 (1022), 6 ліп. 2011 г.
9. Ярмонт Е. В. тени замка Гедимина. / Е. В.Ярмонт – Лида, 1997 с.176
10. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т.4. / Мн. 1997. с.132
11. Лаўрэш Л.Л. Шпацыры па старой Лідзе / Лаўрэш Л.Л. – Гродна: «ЮрСаПрынт», 2020 – 342 с.



Фатаздымак Лідскага замка



Лідскі замак на малюнке Наполеона Орды



Лідскі замак на каруіне Васілія Грязнова. Втарая палавина XIX ст.




Пачатак Крывой вуліцы, вуліца пайшла ўлева, правей бачны фарны касцёл, па правым боку ад фатографа, нябачны на здымку – Лідскі замак. Пачатак XX ст.




Вуліца Сувальская, злева плот гарадскога парка і пачатак вуліцы 3-га Мая, 1920-я гг.




Раён «Ферма», пачатак XX ст.



LIDA. Widok z ruin Zamku



Від з замка на вуліцу Замкавую, канец 1920-гг.




Зарэчча ў 1917 г.

